**Якаўлева, С.** Нявыпітае шампанскае… / С. Якаўлева // Герой працы (Шуміліна). — 2002. — 15 лют. — С. 2.

## НЯВЫПІТАЕ ШАМПАНСКАЕ…

Лена ніколі не паверыла б, што яе мужам будзе ваенны. Яшчэ менш яна, карэнная гараджанка, у якой і сваякаў у вёсцы наогул не было, задумвалася аб магчымасці звязаць свій лёс з вясковым хлопцам. А Анатоль быў менавіта з вёскі, з Дубрава Мікалаеўскага сельсавета. Ён скончыў Сызранскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча. Але калі ён аднойчы запрасіў яе на танец, і іх вочы ўпершыню сустрэліся, Лена адчула: гэта – яе «палавінка». Першае ўраджанне пацвердзіла само жыццё, і праз некаторы час яны стварылі сям'ю. Пазней Анатоль запытаў у маладой жонкі:

– Прызнайся шчыра, калі ты адчула, што закахалася ў мяне? – І пачуўшы адказ, здзіўлена абурыўся:

– Як пасля другой сустрэчы? Я ж – з першага погляду…

Так, пачуццё ўспыхнула хутка і аказалася трывалым. Мабыць, яны сапраўды знайшлі адзін аднаго у вялізным свеце, таму што гады не астудзілі іх сэрцы.

Успаміны аб сумесным жыцці – толькі прыемныя, нават вясёлыя. Аказваецца, Анатоля ледзь адпусцілі на ўласнае вяселле, бо тэлеграма з удакладненнем даты ўрачыстасці не была заверана органамі ЗАГС. А чаго варта было «вясельнае падарожжа» у заснежанае Дубрава пешшу ад Мікіціхі (таксіст наадрэз адмовіўся везці маладажонаў па дрэннай дарозе). Тады літаральна на апошнім кіламетры шляху іх дагнаў рэйсавы аўтобус, і Лене давялося вытрымаць на сабе ўчэпլівае вока ўсёй акругі і нават чыйсці спачувальны ўздых: «Што ж ён такую маленькую ўзяў?»

З мужавай сям'ёй паразуменне знайшлося адразу. Падкупляла сялянская працавітасць і грунтоўнасць яго бацькоў, добразычлівасць братоў і сясцёр. Дарэчы, родным Алены Анатоль таксама адразу спадабаўся. Ды ён і не мог не спадабацца – умеў знайсці тэму для размовы з людзьмі розных узростаў, адукацыі, сацыяльнага становішча. Ён быў заўсёды цікаўным слухачом, шчыра захапляўся агульнай справай, чыстасардэчна аказваў знакі ўвагі, якія былі прыемныя людзям. Яшчэ ён вельмі любіў спяваць, але гэтага зусім не ўмеў і па-дзіцячы крыўдаваў, што ў хор замест яго звычайна запрашалі жонку.

Яны былі шчаслівыя. Разам перажывалі выпрабаванні бытам, што выпалі на іх долю ў Грузіі, крыху вальней уздыхнулі ў час службы ў Венгрыі. Разам радаваліся нараджэнню дзвюх дачок. Анатоль і бацькам аказаўся выдатным, дзяўчынкі яго проста абажалі. Бацька, аднак, мог быць і строгім. Малодшая, Таня, успомніла, як аднойчы сястра Наташа абазвала яе, і яна мела неасцяроднасць паскардзіцца тату. Ён паставіў у вугал абедзвюх – адну за брыдкаслоўе, другую – за скаргу.

Усёй сям'ёй яны стараліся падарожнічаць па памятных месцах, асабліва ў час час службы ў гарнізоне пад Ленінградам. Любілі і проста адпачываць на прыродзе (сямейны альбом захоўвае мноства здымкаў з такіх паездак і паходаў). Не, жыццё іх не было адным толькі святам, цярпелі і нястачы, і разлукі, але ўсе нягоды дапамагала перажыць каханне.

У жніўні 1983 года камандзір верталётнай эскадрыллі маёр Скобаў быў накіраваны ў Афганістан. Жонку, каб не трывожылася, супакойваў: маўляў, я ж лётаю на верталёцеМІ-6, гэта не

баявая машына – ажыцяўляем пасажырскія перавозкі. У адказ на яе просьбы берагчы сябе, запэўніваў, што ён добра лётае ва ўмовах горнай мясцовасці – навучыўся гэтаму ў час службы ў Закаўказскай ваеннай акрузе.

Алена ні на хвіліну не сумнявалася, што з ім нічога не здарыцца, страшныя думкі проста не прыходзілі ёй у галаву.

3 ліпеня 1984 года Анатолю споўнілася 33 гады, праз паўтара месяцы ён павінен быў вярнуцца з краіны, дзе ішла вайна. Жонка купіла шампанскае – адзначыць урачыстасць будучай.

14 ліпеня, як сведчаць афіцыйныя дакументы, «верталёт, у якім знаходзіўся Анатоль Мікалаевіч Скобаў, пры выкананні баявога задання ў раёне горада Кундуз быў падбіты артылерыяй праціўніка. Экіпаж і пасажыры загінулі».

Самае святое на зямлі месца для сям'і Скобавых – магіла Анатоля на Мазурынскіх могілках у Віцебску. І ў дні смутку, і ў дні радасці яны ідуць да помніка з чорнага граніту – падзяліцца навінамі, спытаць парады ў добрага чалавека, проста паплакаць ці памаўчаць.

Мяне вельмі ўразіла, што Алена Аляксандраўна, якая 12 год была замужам і ўжо 18 год – удава, расказвала пра свайго мужа так, быццам ён проста выйшаў і вось-вось з усмешкай адкрые дзверы.

Любая вайна страшная перш-наперш чалавечымі азвярамі і трагедыямі. І для тых, каго апаліў Афганістан, яна наўрад ці скончылася і дагэтуль.

Вось і Алена Аляксандраўна Скобава, жыхарка Віцебска, мужна нясе па жыцці тытул жонкі камандзіра, аб якім нагадалі ёй таварышы мужа, калі яна была зломлена горам. Разам з бацькамі, роднымі Анатоля яны перажылі тую вялізную страту, і зараз, калі ўжо прайшлі гады, падтрымліваюць паміж сабою добрыя чалавечыя адносіны.

Алена Аляксандраўна звярае ўчынкі, раўняючыся на памяць пра мужа. Яна не ўладкавала асабістае жыццё, дагэтуль чэрпае любоў і шчасце ва ўспамінах колішняй даўніны. Сваіх дзяўчат яна вырасціла, паставіла на ногі. Наталля атрымала вышэйшую эканамічную адукацыю, ужо замужам, мае чатырохгадовую дачку. Таццяна вучыцца ў ВНУ на факультэце замежных моў. Алена Аляксандраўна лічыць, што муж мог бы імі ганарыцца.

Свой жаночы і мацярынскі абавязак яго жонка таксама выканвае годна, гэтак жа выканаў свой воінскі абавязак – кавалер ордэна Чырвонай Зоркі і «За службу Радзіме» наш зямляк маёр Анатоль Мікалаевіч Скобаў.

**С. Якаўлева**